

# КРЫНІЧКА

Дзяржаўная ўстанова адукацыі
“Чэрнікаўшчынскі вучэбна-педагагічны комплекс
дзіцячы сад – базавая школа”

Выпуск №2 (18)
Кастрычнік 2021

## У нумары:



| | |
|---|---|
| **Са святам, шаноўныя настаўнікі!!!** | **Стар. 1** |
| **У школе прайшоў Тыдзень маці** | **Стар. 2** |
| **Тыдзень прававых ведаў: падводзім вынікі** | **Стар. 3** |
| **Сустрэча з інспектарам ДАІ** | **Стар. 4** |
| **Знаёмімся: Рэбека Ю.І., інспектар ІСН** | **Стар. 4** |
| **ШАГ: Школа Актыўнага Грамадзяніна** | **Стар. 5** |
| **Восеньская ярмарка** | **Стар. 6** |



# Са святам, шаноўныя настаўнікі!!!



# У школе прайшоў Тыдзень маці




У сярэдзіне восені - 14 кастрычніка - з 1996 года Беларусь адзначае Дзень маці. Дата святкавання прымеркавана да вялікага праваслаўнага свята - Пакрова Прасвятой Багародзіцы.

З 11 па 16 кастрычніка ў школе праходзіў Тыдзень маці, у рамках якога былі праведзены наступныя мерапрыемствы:

- тэматычная выстава "Мама - першае слова, галоўнае слова...", акцыя “Дзесятка для мамы”





- фотавыстава “Я і мая мама”, конкурс малюнкаў “Мілай мамачцы маёй”, тэматычнае афармленне класных кабінетаў






Завяршыў Тыдзень маці святочны канцэрт, які адбыўся 16 кастрычніка ў рамках шостага школьнага дня.








# Тыдзень прававых ведаў: падводзім вынікі




З 18 па 23 кастрычніка ў школе праходзіў Тыдзень прававых ведаў, у рамках якога былі праведзены шматлікія мерапрыемствы:

- тэматычная выстаўка ў школьнай бібліятэцы "Кожны ў праве ведаць аб праве". Экспанаты выстаўкі былі прадстаўлены ў выглядзе мастацкай, вучэбнай літаратуры і нарматыўна-прававых актаў:






- тэматычныя класныя і інфармацыйныя гадзіны "Мае правы і абавязкі", "Прафілактыка правапарушэнняў у сетцы інтэрнэт", конкурс дзіцячага малюнка "Я малюю свае правы", распрацоўка і распаўсюджванне тэматычных буклетаў:







У завяршэнне Тыдня прававых ведаў у школьнай бібліятэцы прайшла пазнавальная гульня-віктарына "Дзецям аб правах дзіцяці". Падчас мерапрыемства навучэнцы азнаёміліся з гісторыяй узнікнення першых дакументаў аб правах чалавека і дзіцяці. На прыкладзе герояў знакамітых казак вызначылі, чые і якія правы былі парушаны.










# Сустрэча з інспектарам ДАІ

27 кастрычніка адбылася сустрэча навучэнцаў з інспектарам дарожна-патрульнай службы АДАІ Дзяржынскага РАУС Саладухай Е.С., падчас якой была праведзена прафілактычная гутарка "Пешаходны пераход - тэрыторыя павышанай увагі". У сваім выступленні Саладуха Е.С. таксама звярнуў увагу хлопчыкаў і дзяўчынак на прычыны і наступствы дзіцячага дарожна-транспартнага траўматызму.









# Знаёмімся: Рэбека Юлія Вітальеўна, інспектар інспекцыі па справах непаўналетніх Дзяржынскага РАУС



Участковы інспектар інспекцыі па справах непаўналетніх Дзяржынскага РАУС

**Рэбека Юлія Вітальеўна**

Тэлефон службовы: 8(01716) 65430

Рабочы кабінет №110 размешчаны ў адміністрацыйным будынку Дзяржынскага РАУС па адрасе: г. Дзяржынск, вул. Фамініх, 1а.

# ШАГ: Школа Актыўнага Грамадзяніна

28 кастрычніка для навучэнцаў 8-9 класаў прайшоў адзіны дзень інфармавання ў рамках рэспубліканскага праекта "Школа Актыўнага Грамадзяніна" на тэму: "Гонар за Беларусь. Здароўе кожнага з нас - галоўная каштоўнасць" (аб дасягненнях аховы здароўя, фармацэўтыкі).

Тэма была цікавая вучням. Выступіла медработнік Кужоўнік Таццяна Васільеўна, якая звярнула ўвагу на прафілактыку каранавіруснай інфекцыі COVID-19. Прагучала пытанне аб неабходнасці вакцынацыі і рэкамендуемых вакцынах. Вучні зрабілі вывад аб тым, што медыцына ў Рэспубліцы Беларусь развіваецца і знаходзіцца на дастойным узроўні.






# Аб’ява!!!




Да ўвагі бацькоў і навучэнцаў!

З 1 па 6 кастрычніка ўключна ў школе будзе працаваць школьны аздараўленчы лагер “Вясёлка” з дзённым наведваннем. Наведвальнікаў лагера чакае насычаны і актыўны адпачынак, шматлікія цікавыя справы, спартыўныя мерапрыемствы і вясёлы час з сябрамі!

За падрабязнай інфармацыяй звяртайцеся да класных кіраўнікоў.

# Восеньская ярмарка




Ярмарка! Ярмарка! Удалая ярмарка!
Это песни, это пляски, это звонкий детский смех.
Игры, шутки и забавы, хватит радости для всех.
Ярмарка огневая, яркая! Ярмарка плясовая, жаркая!
Гляньте налево – лавки с товаром,
Гляньте направо – веселье даром!

30 кастрычніка ў рамках шостага школьнага дня ва ўстанове адбылося мерапрыемства "Восеньская ярмарка". Было шмат весялосці, танцаў, песняў. Дзеці атрымалі масу станоўчых эмоцый.











Рэдкалегія: вучні 5 класа, Баркоўская Г.І., класны кіраўнік 5 класа.
Газета выходзіць 1 раз у месяц на працягу навучальнага года.
Наступны нумар выйдзе 30 лістапада.